**6. Развіццё і размяшчэнне вытворчасці фармацэўтычнай прадукцыі.** Фармацэўтычная прамысловасць Беларусі — адна з падгалін, якія найбольш дынамічна развіваюцца. Прадпрыемствы фармацэўтыкі размешчаны ў Мінску, Барысаве, Віцебску і іншых гарадах (мал. 118). Яны вырабляюць каля 400 найменняў лекавых сродкаў і медыцынскіх прэпаратаў. Фармацэўтычная прадукцыя мае экспартнае значэнне.

**Падвядзём вынікі.** Каля 70 % прадукцыі хімічнай прамысловасці ідзе на экспарт. Беларусь займае трэцяе месца ў свеце па вытворчасці калійных угнаенняў, спецыялізуецца на вытворчасці хімічных валокнаў, пластмас, шын, лакафарбавых матэрыялаў, бытавой і парфумерна-касметычнай прадукцыі.

***Праверце сябе.*** 1. Назавіце асноўныя фактары размяшчэння хімічнай прамысловасці. 2. Якая сыравіна выкарыстоўваецца на прадпрыемствах? 3. Якія віды хімічных валокнаў вырабляюць у Беларусі?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Чаму экспартуецца вялікая доля прадукцыі хімічнай прамысловасці? 2. Чаму ў Беларусі атрымала развіццё вытворчасць мінеральных угнаенняў? 3. Якую прадукцыю хімічнай прамысловасці вырабляюць у вашым рэгіёне?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Вам прапанавалі выступіць на канферэнцыі. Падрыхтуйце даклад «Дасягненні хімічнай прамысловасці Беларусі».

## § 36. Геаграфія прамысловасці будаўнічых матэрыялаў

***Успомніце.*** *Якія радовішчы карысных выкапняў ствараюць сыравінную базу прамысловасці будаўнічых матэрыялаў?*

**1. Фактары размяшчэння вытворчасці будаўнічых матэрыялаў.** Прамысловасць будаўнічых матэрыялаў мае вялікае значэнне для развіцця краіны. Гэта звязана з неабходнасцю ўзводзіць жыллё, розныя аб'екты гаспадарчага і сацыяльна-культурнага прызначэння. Прамысловасць будаўнічых матэрыялаў — аснова будаўніцтва.

Прадпрыемствы галіны арыентуюцца на сыравіну і спажыўца. Малыя па магутнасці прадпрыемствы размяшчаюцца ў асноўным каля радовішчаў карысных выкапняў, буйныя заводы — у вялікіх гарадах альбо каля радовішчаў. Развіццю галіны ў Беларусі спрыяе наяўнасць сыравіны ў спалучэнні з працоўнымі рэсурсамі і вялікім попытам на прадукцыю.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Вытворчасць будаўнічых матэрыялаў** →
- шкла і вырабаў са шкла
- керамічных вырабаў
- цэглы, чарапіцы і іншых будаўнічых вырабаў з абпаленай гліны
- цэменту, вапны і гіпсу
- вырабаў з бетону
- нярудных будаўнічых матэрыялаў

Мал. 120. Структура вытворчасці будаўнічых матэрыялаў у Беларусі

> На пачатку XX ст. невялікія рамесныя прадпрыемствы выраблялі ў асноўным цэглу, шкляны посуд, кафлі. Пазней былі пабудаваны цэментны завод у Крычаве, шклозавод у Касцюкоўцы, цагельні ў Оршы і Клімавічах, вапнавыя заводы каля Віцебска. Чаму вытворчасць будаўнічых матэрыялаў атрымала развіццё яшчэ на пачатку XX ст.?

У цяперашні час на долю галіны прыпадае каля 6 % прамысловай вытворчасці. Галіна спецыялізуецца на вытворчасці вапны, цэглы, бетону, зборных жалезабетонных канструкцый, будаўнічага шкла, керамічных вырабаў (мал. 120). Прадпрыемствы пастаўляюць на экспарт каля 50 відаў прадукцыі.

**2. Геаграфія вытворчасці шкла і вырабаў са шкла, керамічных вырабаў.** Буйныя прадпрыемствы па вытворчасці шкла знаходзяцца ў Касцюкоўцы каля Гомеля, Бярозаўцы Лідскага раёна і іншых гарадах (мал. 121, 122). З-за недастатковай сыравіннай базы падгаліна ў асноўным працуе на прывазной сыравіне.

Дзе ў Беларусі здабываюць шкловыя пяскі?



Мал. 121. Шклозавод «Нёман», г. Бярозаўка

**Мінск (1)**

**«Керамін»:** керамічная плітка, санітарна-тэхнічная кераміка
**«БЕЛГІПС»:** гіпсакардон, сухія будаўнічыя сумесі
**Мінскі камбінат будаўнічых матэрыялаў**
**«Еўрадруз»:** друз, жвір
**«Мінскжалезабетон»:** бетонныя, жалезабетонныя канструкцыі
**Мінскі камбінат сілікатных вырабаў:** цэгла

**«Полацкбудматэрыялы» (3), «Кераміка» (4):** будматэрыялы
**«Даламіт» (4):** даламітавая мука для сельскай гаспадаркі, вапна і друз для будаўніцтва
**«Оршабудматэрыялы» (5):** будматэрыялы, цэгла
**Завод жалезабетонных вырабаў і канструкцый (5):** бетонныя, жалезабетонныя канструкцыі

**«Белмедшкло» (2):** фармацэўтычныя вырабы са шкла

**Гродна (15)**

**Гродзенскі шклозавод:** будаўнічае шкло, шкляная тара
**Гродзенскі камбінат будаўнічых вырабаў**

**«Краснасельск-будматэрыялы» (16):** шыфер, вапна, азбестацэментныя трубы
**Шклозавод «Нёман» (17):** вырабы з крышталю і шкла
**«Смаргоньсіліката-бетон» (18):** цэгла




1. Мінск
2. Барысаў
3. Полацк
4. Віцебск
5. Орша
6. Магілёў
7. Асіповічы
8. Крычаў
9. Касцюковічы
10. Гомель
11. Добруш
12. Брэст
13. Бяроза
14. Мікашэвічы
15. Гродна
16. Краснасельскі
17. Бярозаўка
18. Смаргонь

**«Магілёўжалезабетон» (6):** бетонныя, жалезабетонныя канструкцыі
**Магілёўскі камбінат сілікатных вырабаў (6):** цэгла
**«Дахавы завод ТэхнаНІКОЛЬ» (7):** руберойд, дахавы матэрыял
**«Крычаўцэментна-шыфер» (8):** цэмент і шыфер
**Беларускі цэментны завод (9):** цэмент і шыфер

**«Гомельшкло» (10):** ліставое, мэблевае шкло, транспартныя шклопакеты
**«Гомельбуд-матэрыялы» (10):** будматэрыялы
**Добрушскі фарфоравы завод (11):** фарфора-фаянсавая прадукцыя

**Брэсцкі камбінат будаўнічых матэрыялаў (12):** керамічная плітка, санітарна-тэхнічная кераміка
**«Бярозабудматэрыялы» (13):** керамічная плітка, санітарна-тэхнічная кераміка
**«Граніт» (14):** друз, абліцовачная плітка, кубічны камень

Мал. 122. Прадпрыемствы па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў у Беларусі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У Беларусі створаны холдынг «Беларуская шкловая кампанія». У склад холдынга ўваходзяць чатыры буйныя шкловыя прадпрыемствы: Гродзенскі шклозавод, «Гомельшкло», шклозавод «Нёман» і Белмедшкло. Дзякуючы шырокаму асартыменту і высокай якасці прадукцыя холдынга вядомая як у Беларусі, так і далёка за яе межамі.

Хуткімі тэмпамі ў апошнія гады развіваецца вытворчасць керамічных вырабаў, кафлі. Найбуйнейшыя прадпрыемства падгаліны знаходзяцца ў Мінску. Яны маюць сучасную тэхніку і тэхналогію для выпуску пліткі, якая здольная канкураваць на замежных рынках. Прадпрыемства ў Добрушы вырабляе якасную фарфора-фаянсавую прадукцыю.

По мал. 122 вызначце, на якіх прадпрыемствах вырабляюць керамічную плітку.

**3. Геаграфія вытворчасці цэглы, чарапіцы і іншых будаўнічых вырабаў з абпаленай гліны.** Вытворчасць даволі развітая ў Беларусі. Найбольшыя магутнасці па вытворчасці цэглы маюць Брэсцкі, Аршанскі, Мінскі камбінаты будматэрыялаў, Віцебскі завод «Кераміка», Магілёўскі камбінат сілікатных вырабаў і інш. (мал. 122).

Пакажыце на карце атласа (с. 57) прадпрыемствы па вытворчасці цэглы.

**4. Геаграфія вытворчасці цэменту, вапны і гіпсу, вырабаў з бетону.** Цэментная прамысловасць застаецца найважнейшай падгалінай. Сыравінай для вытворчасці цэменту ў Беларусі з'яўляюцца мел, мергель, гліны.

Вытворчасць цэменту сканцэнтравана ў дзвюх абласцях — Магілёўскай (64 %) і Гродзенскай (36 %), дзе працуюць цэментныя прадпрыемствы.

Чаму менавіта ў Магілёўскай і Гродзенскай абласцях сканцэнтравана вытворчасць цэменту?

Лідарамі ў Рэспубліцы Беларусь у галіне вытворчасці цэменту з'яўляюцца тры прадпрыемствы: «Крычаўцэментнашыфер», Беларускі цэментны завод, «Краснасельскбудматэрыялы», якія ўваходзяць у холдынг «Беларуская цэментная кампанія» (мал. 122, 123). Магутнасць гэтых заводаў склала больш за 5 млн т у год. Гэта дае магчымасць цалкам задаволіць патрэбы краіны і паспяхова экспартаваць сваю прадукцыю.



Мал. 123. Беларускі цэментны завод, г. Касцюковічы

Самыя буйныя прадпрыемствы па вытворчасці вапны і гіпсу працуюць у Віцебску і Мінску. Вытворчасць блокаў і панэлей, бетонных і жалезабетонных канструкцый засяроджана ў Мінску, Магілёве, Оршы, руберойду — у Асіповічах.

Якая сыравіна неабходная для вытворчасці вапны і гіпсу?

**5. Вытворчасць нярудных будаўнічых матэрыялаў.** Прадпрыемствы гэтай падгаліны спецыялізуюцца на здабычы, драбненні і ўзбагачэнні будаўнічага каменю, друзу, жвіру, будаўнічага пяску. Найбуйнейшыя прадпрыемствы знаходзяцца ў Мікашэвічах (Брэсцкая вобласць) і Мінску.

**Падвядзём вынікі.** Вытворчасць будаўнічых матэрыялаў арыентуецца на ўласную сыравіну і спажыўца. Беларусь спецыялізуецца на вытворчасці цэменту, вапны, цэглы, бетону, зборных жалезабетонных і бетонных канструкцый, будаўнічага шкла, керамічных вырабаў.

***Праверце сябе.*** 1. Назавіце асноўныя фактары размяшчэння вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. 2. У якіх цэнтрах арганізавана вытворчасць шкла і вырабаў са шкла, керамічных вырабаў? 3. Якія віды прадукцыі выпускае цэментная прамысловасць?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Чаму з кожным годам узрастае роля вытворчасці будаўнічых матэрыялаў у Беларусі? 2. Якія існуюць перспектывы і магчымасці развіцця вытворчасці будаўнічых матэрыялаў?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Вам трэба выступіць на будаўнічым форуме і паказаць вытворчасць будаўнічых матэрыялаў у Беларусі. Распрацуйце для свайго выступу буклет «Прадукцыя вытворчасці будаўнічых матэрыялаў».

## § 37. Геаграфія дрэваапрацоўчай, мэблевай і цэлюлозна-папяровай прамысловасці

***Успомніце.*** *Чаму дрэваапрацоўчая, мэблевая і цэлюлозна-папяровая прамысловасць адносіцца да адной з найстарэйшых галін гаспадаркі?*

**1. Структура і фактары размяшчэння дрэваапрацоўчай прамысловасці.** Дрэваапрацоўчая прамысловасць — адна з найстарэйшых і найважнейшых галін прамысловасці Беларусі. Галіна ўключае групу вытворчасцей, звязаных з нарыхтоўкай, механічнай і хімічнай апрацоўкай драўніны (мал. 124).

У структуры апрацоўчай прамысловасці Беларусі на долю апрацоўкі драўніны і вытворчасці вырабаў з дрэва прыпадае каля 7 %. Найбуйнейшыя прадпрыемствы дрэваапрацоўкі аб’ядноўвае канцэрн



Правообладатель Адукацыя і выхаванне